# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Курс «Гісторыя Беларусі» на дзённым падрыхтоўчым аддзяленні факультэта даўніверсітэцкай падрыхтоўкі разлічаны на паглыбленне, сістэматызацыю і абагульненне ведаў слухачоў, далучэнне іх да нацыянальных і сусветных культурных традыцый, выхаванне асобы, здольнай да самарэалізацыі ва ўмовах сучаснай сацыякультурнай сітуацыі.

Рабочая праграма складзена на падставе “Праграмы ўступных іспытаў па вучэбным прадмеце “Гісторыя Беларусі” для асоб, якія маюць агульную сярэднюю адукацыю, для атрымання вышэйшай адукацыі І ступені ці сярэдняй спецыяльнай адукацыі” на 2017 год, зацверджанай загадам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь 28.10. 2016 г. за № 847.

**Мэта курса** - забяспечыць засваенне ведаў гісторыі сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага жыцця беларускага народа на базавым і паглыбленым узроўнях для далейшай паспяховай здачы ўступных іспытаў у выглядзе Цэнтралізаванага тэсціравання; садзейнічаць фарміраванню культуры гістарычнага мыслення і развіццю імкнення да бесперапыннай самаадукацыі, да пастаяннага абнаўлення ўласных ведаў; удасканаліць спосабы пазнаваўчай дзейнасці слухачоў у працэсе самастойнага вывучэння дадатковай вучэбнай і энцыклапедычнай літаратуры, гістарычных крыніц.

Для дасягнення пастаўленай мэты прадугледжваецца рэалізаваць наступныя **задачы:**

– высветліць узровень падрыхтоўкі слухачоў напярэдадні пачатку навучання, актуалізаваць папярэднія веды, уменні і навыкі;

– дапамагчы слухачам лепш зразумець агульнае і асаблівае ў гісторыі Беларусі, разглядаючы гістарычныя падзеі ў кантэксце сусветнай гісторыі;

– забяспечыць засваенне слухачамі неабходнай інфармацыі, якая дазволіць не толькі добра арыентавацца ва ўсіх гістарычных перыядах і разумець агульную логіку гістарычнага развіцця беларускага народа, яго дзяржаўнасці і культуры, але і канкрэтызаваць гэтыя агульныя веды праз вывучэнне тэрмінаў і знаёмства з асноўнымі падзеямі ў іх храналагічнай паслядоўнасці;

– сфарміраваць у слухачоў уяўленне аб дзейнасці вядомых грамадскіх, дзяржаўных і ваенных дзеячоў беларускай гісторыі;

– садзейнічаць пры вывучэнні курса фарміраванню ў слухачоў універсальных уменняў і навыкаў вучэбнай дзейнасці (уменні і навыкі работы с вучэбнай і справачнай літаратурай, гістарычнымі дакументамі і картамі, самастойнага пошуку адказа на пастаўленае пытанне і крытычнага асмыслення атрыманай інфармацыі, і г.д.);

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

– садзейнічаць фарміраванню ўмення вылучаць прычынна-выніковыя сувязі паміж фактамі, падзеямі і працэсамі, аналізаваць гістарычныя факты і з'явы с пазіцыі лагічнага асмыслення;

– садзейнічаць фарміраванню ўмення працаваць з тэставымі заданнямі рознага ўзроўню і рознай формай адказу (закрытай і адкрытай), картаграфічнымі тэставымі заданнямі;

– забяспечыць пастаянны кантроль за засваеннем вучэбнага матэрыялу на занятках і падчас самастойнай работы слухачоў;

– стварыць умовы для далучэння ўсіх слухачоў у інфармацыйна-адукацыйнае ўзаемадзеянне,

– стварыць умовы для павышэння культуры зносін і, такім чынам, садзейнічаць развіццю камунікатыўных навыкаў.

**Асноўнай формай арганізацыі работы** пад час выкладання курса з'яўляюцца <u>практычныя заняткі</u>, наведванне якіх – абавязковая ўмова выканання вучэбнага плана. Дзеля больш глыбокага вывучэння пэўнай тэмы і фарміравання шэрагу практычных уменняў і навыкаў пазнавальнай дзейнасці (самастойна працаваць з літаратурай, першакрыніцамі, дакументамі, перыядычным друкам, даведнікамі і энцыклапедыямі, творча аналізаваць прачытанае, сістэматызаваць яго, дакладна і аргументавана распавядаць аб гістарычных падзеях і фактах і да т.п.) праграмай прадугледжваецца самастойная работа слухачоў. З аднаго боку самастойная работа з'яўляецца асобнай формай навучання і відам навучальнай працы, якая ажыццяўляецца без непасрэднага ўмяшальніцтва выкладчыка, з другога – сродкам уцягвання слухачоў у самастойную пазнавальную дзейнасць, сродкам фарміравання ў іх спосабаў і навыкаў яе арганізацыі і ажыццяўлення. Формамі кантроля эфектыўнасці самастойнай працы з'ўляюцца пераважна вусныя адказы па тэме, дыскусіі і падрыхтоўка паведамленняў, а таксама выкананне тэставых заданняў. Для правядзення заняткаў прадугледжана поўнае арганізацыйна-метадычнае забеспячэнне. Асноўнымі відамі самастойнай работы слухачоў з'яўляюцца як рэпрадуктыўныя (праца з вучэбнымі дапаможнікамі, даведнікамі і энцыклапедыямі, прагляд відэафільмаў і г.д.), так і прадуктыўныя (вырашэнне задач творчага характару, канспекціраванне і падрыхтоўка паведамленняў па пройдзенай тэме, аналітычная праца з першакрыніцамі і г.д.).

Для паглыблення ведаў і пашырэння кругагляду слухачоў прадугледжваюцца экскурсіі ў Нацыянальны музей гісторыі і культуры Рэспублікі Беларусь, у Нацыянальны мастацкі музей і інш.

**Да асноўных метадаў навучання і выхавання** падчас выкладання курса можна аднесці наступнае. У залежнасці ад крыніцы атрымання ведаў: славесныя (гутарка, праца з друкаванымі і электронннымі крыніцамі і г.д.); наглядныя (выкарыстанне гістарычных карт, прагляд вучэбных відэафільмаў і да т.п.); практычныя (самастойная падрыхтоўка/вывучэнне шэрагу тэм,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

прадугледжаных праграмай) метады. У залежнасці ад характара пазнаваўчай дзейнасці слухачоў па засваенні вучэбнага матэрыялу: тлумачальна-ілюстратыўны, рэпрадуктыўны, часткова-пошукавы, праблемны метады і г.д.

**Асноўнымі формамі прамежкавага і выніковага кантролю ведаў** слухачоў падчас вывучэння курса з'яўляюцца вусныя адказы, залікі па асобным раздзелам праграмы, дэканскія кантрольныя работы і выніковы залік пасля заканчэння навучання, якія праводзяцца ў форме тэсціравання.

У выніку вывучэння курса "Гісторыя Беларусі" **слухачы павінны ведаць**: тэарэтычны, факталагічны, у тым ліку храналагічны і картаграфічны, вучэбны матэрыял; разумець асаблівасці дзяржаўна-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, этнаканфесіянальнага развіцця беларускага народа, яго матэрыяльнай і духоўнай культуры; асноўныя гістарычныя паняцці, даваць характарыстыку ўдзельнікам гістарычных падзей.

**А таксама ўмець:**

- суадносіць гістарычныя з'явы і працэсы гісторыі Беларусі з адпаведнымі з'явамі і працэсамі агульнаеўрапейскай гісторыі;
- характарызаваць палітычнае становішча Беларусі на розных этапах гістарычнага развіцця;
- характарызаваць і ацэньваць вынікі дзейнасці гістарычных асоб і творчасці дзеячаў культуры;
- тлумачыць прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі фактамі;
- сістэматызаваць і абагульняць гістарычныя факты, рабіць на гэтай падставе аргументаваныя высновы;
- выкарыстоўваць змест гістарычнай карты;
- параўноўваць гістарычныя факты па самастойна вызначаных крытэрыях;
- канкрэтызаваць тэарэтычныя высновы і змест гістарычных паняццяў;
- весці комплексны вышук гістарычнай інфармацыі ў крыніцах рознага тыпу.
- авалодаць навыкамі працы з тэставымі заданнямі закрытага і адкрытага тыпу, картаграфічнымі тэставымі заданнямі
- авалодаць навыкамі канспекціравання вывучаемага матэрыялу.

**На курс "Гісторыя Беларусі" адводзіцца** вучэбным планам **330 аўдыторных гадзін**. Ад агульнай колькасці вучэбнага часу на першы семестр прыпадае 220 гадзін і астатнія 110 – на другі семестр.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| НАЗВА РАЗДЗЕЛА | НАЗВА ТЭМЫ | КОЛЬКАСЦЬ АЎДЫТОРНЫХ ГАДЗІН |
|---|---|---|
| **РАЗДЗЕЛ I. БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ СА СТАРАЖЫТНЫХ ЧАСОЎ ДА СЯРЭДЗІНЫ XIII СТ.** | **ЧАСТКА 1.1. СТАРАЖЫТНАЕ ГРАМАДСТВА НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ.** | |
| | Уводзіны. | 4 |
| | Старажытнае грамадства ў эпоху каменнага і бронзавага вякоў. | 8 |
| | Насельніцтва Беларусі ў жалезным веку (VIII-VII ст. да н.э. – IV-V ст.н.э.). | 4 |
| | Побыт, звычаі і мастацтва першабытных людзей. | 4 |
| | **ЧАСТКА 1.2. УЗНІКНЕННЕ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ КЛАСАВАГА ШМАТУКЛАДНАГА ГРАМАДСТВА І ДЗЯРЖАЎНАСЦІ (V-VI СТСТ. – ПЕРШАЯ ПАЛОВА XIII СТ.).** | |
| | Насельніцтва беларускіх зямель у V — канцы IX ст. | 4 |
| | Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель у IX — сярэдзіне XIII ст. Зараджэнне феадальных адносін. | 4 |
| | Дзяржаўнасць усходніх славян. Княствы на тэрыторыі Беларусі. | 8 |
| | Духоўная і матэрыяльная культура ўсходніх славян. | 4 |
| | Прыняцце і распаўсюджванне хрысціянства ва Ўсходняй Еўропе. | 4 |
| | Культура беларускіх зямель у IX — сярэдзіне XIII ст. | 2 |
| | Беларускія землі ў канцы XII – першай палове XIII ст. | 2 |
| **РАЗДЗЕЛ II. БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў СЯРЭДЗІНЕ XIII – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVI СТ.** | Палітычная сітуацыя на беларускіх землях сярэдзіны XIII ст. Утварэнне Вялікага Княства Літоўскага. | 4 |
| | Унутрыпалітычнае становішча і знешняя палітыка ВКЛ у канцы XIII -70-я гг. XIV ст. | 8 |
| | Вялікае княства Літоўскае ў канцы XIV-XV ст.: унутраная і знешняя палітыка. | 8 |
| | Палітычнае становішча ВКЛ у першай палове XVI ст. | 4 |
| | Дзяржаўны лад, органы ўлады і кіравання ў ВКЛ. | 4 |
| | Эканамічнае развіццё і сацыяльныя адносіны ў ВКЛ у XIV – першай палове XVI ст. | 8 |
| | Культура Беларусі ў другой палове XIII — першай палове XVI ст. | 8 |
| | Фарміраванне беларускай народнасці. | 4 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | |
|---|---|---|
| **Раздзел III. Беларускія землі ў другой палове XVI – канцы XVIII ст.** | Утварэнне Рэчы Паспалітай. Становішча ВКЛ у палітычнай сістэме Рэчы Паспалітай. | 8 |
| | Сельская гаспадарка і гарадское жыццё ў ВКЛ у другой палове XVI — XVII ст. | 8 |
| | Царква і рэлігія на беларускіх землях у XVI — першай палове XVII ст. | 4 |
| | Знешняя палітыка РП у канцы XVI – першай палове XVII ст. | 4 |
| | Беларусь у час войнаў сярэдзіны XVII ст. | 4 |
| | Беларусь у час войнаў першай паловы XVIII ст. | 4 |
| | Сацыяльна-эканамічнае становішча Беларусі ў XVIII ст. | 4 |
| | Палітычны крызіс Рэчы Паспалітай і яе падзелы. | 8 |
| | Адукацыя і навука Беларусі ў другой палове XVI — XVIII ст. | 4 |
| | Культура Беларусі ў другой палове XVI — XVIII ст. Уплыў Асветніцтва. | 4 |
| **Раздзел IV. Беларусь у XIX — пачатку XX ст.** | Грамадска-палітычнае становішча ў Беларусі ў першай палове XIX ст. Вайна 1812 г. | 4 |
| | Грамадска-палітычны рух у Беларусі ў першай палове XIX ст. | 8 |
| | Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель у першай палове XIX ст. | 8 |
| | Культура Беларусі ў першай палове XIX ст. | 4 |
| | Адмена прыгоннага права. Асаблівасці буржуазных рэформ другой паловы XIX ст. у Беларусі | 8 |
| | Грамадска-палітычны рух у другой палове XIX — пачатку XX ст. у Беларусі. | 4 |
| | Развіццё сельскай гаспадаркі ў Беларусі ў другой палове XIX — пачатку XX ст. | 4 |
| | Развіцце капіталізму ў прамысловасці. Беларусі ў другой палове XIX — пачатку XX ст. | 4 |
| | Беларусь у перыяд першай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі (1905—1907 гг.) | 4 |
| | Становішча Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны | 4 |
| | Беларусь у перыяд Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. | 4 |
| | Культура Беларусі ў другой палове XIX ст. – пачатку XX ст. Фарміраванне беларускай нацыі. | 4 |
| | Культура Беларусі ў другой палове XIX ст - пачатку XX ст. | 4 |
| | **Частка 5.1 Беларусь у 1917–1939 гг.** | |
| | Кастрычніцкая рэвалюцыя ў Беларусі і ўстанаўленне Савецкай улады. | 4 |
| | Абвяшчэнне і ўтварэнне беларускай дзяржаўнасці. | 8 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | |
|---|---|---|
| **Раздзел V. БЕЛАРУСЬ У 1917—1945 гг.** | Барацьба з польскай інтэрвенцыяй. Другое абвяшчэнне БССР. | 4 |
| | БССР у гады новай эканамічнай палітыкі. | 4 |
| | Грамадска-палітычнае жыццё БССР у гады нэпа. | 4 |
| | Палітыка беларусізацыі. Развіццё адукацыі, навукі і культуры ў БССР у 1920-я гг. | 4 |
| | БССР у канцы 1920-х — 1930-я гг. | 4 |
| | Беларуская савецкая культура ў 1920-я — 1930-я гг. | 4 |
| | Становішча Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы. | 4 |
| | **Частка 5.2. Беларусь у гады Другой сусветнай вайны 1939–1945 гг.** | |
| | Пачатак Другой сусветнай вайны. Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР. | 8 |
| | Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. | 4 |
| | Барацьба беларускага народа супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў. | 8 |
| | Вызваленне БССР ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Заканчэнне Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў. | 4 |
| **Раздзел VI. БССР У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 1940-х — 1980-я гг.** | БССР у 1945—1953 гг. Удзел БССР у заснаванні ААН. | 6 |
| | Грамадска-палітычнае і культурнае жыццё БССР у 1945—1953 гадах. | 2 |
| | Сацыяльна-эканамічнае развіццё БССР у другой палове 1950-х — першай палове 1980-х гг. | 8 |
| | Грамадска-палітычнае жыццё ў БССР у другой палове 1950-х — першай палове 1980-х гг. | 4 |
| | БССР у другой палове 1980-х гг. | 6 |
| | Развіццё адукацыі і навукі, літаратуры і мастацтва ў БССР у другой палове 1950-х — 1980-я гг. | 4 |
| **Раздзел VII. РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ у 1991 г. — пачатку XXI ст.** | Абвяшчэнне і станаўленне дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь. | 8 |
| | Грамадска-палітычнае жыццё ў РБ у другой палове 1990-х гг. — пачатку XXI ст. | 4 |
| | Сацыяльна-эканамічнае развіццё Рэспублікі Беларусь. | 4 |
| | Міжнароднае становішча і знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь. | 4 |
| | Развіццё культуры ў Рэспубліцы Беларусь. | 4 |
| | **Ітаго:** | 330 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## РАЗДЗЕЛ І. БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ СА СТАРАЖЫТНЫХ ЧАСОЎ ДА СЯРЭДЗІНЫ ХІІІ СТ.

### ЧАСТКА 1.1. СТАРАЖЫТНАЕ ГРАМАДСТВА НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ.

**Тэма 1.1.1. Уводзіны.**

Гісторыя як навука. Прадмет і задачы гістарычнай навукі. Яе функцыі, месца і роля ў сучасным свеце. Гісторыя Беларусі як самастойны кірунак сучаснага грамадазнаўства. Паняцце гістарычнага часу. Асноўныя канцэпцыі перыядызацыі гістарычнага працэсу. Перыядызацыя гісторыі Беларусі. Перыядызацыя гісторыі першабытнага грамадства Беларусі.

**Тэма 1.1.2. Старажытнае грамадства ў эпоху каменнага і бронзавага вякоў.**

Засяленне тэрыторыі Беларусі першабытнымі людзьмі. Першыя стаянкі. Умовы жыцця і асаблівасці вырабу прылад працы. Заняткі і промыслы старажытных жыхароў. Спажывецкая гаспадарка. Пранікненне на тэрыторыю Беларусі індаеўрапейцаў. Пачатак металаапрацоўкі. Пераход ад спажывецкай да вытворчай гаспадаркі. Супольнасці людзей каменнага і бронзавага вякоў. Эвалюцыя шлюбна-сямейных адносін і грамадскага ладу ў каменным і бронзавым вяках.

**Тэма 1.1.3. Насельніцтва Беларусі ў жалезным веку (VIII-VII ст. да н.э. – IV-V ст.н.э.).**

Асноўнае насельніцтва Беларусі ў VIII-VII ст. да н.э. – сярэдзіне I тысячагоддзя н.э. Праблемы яго паходжання і этнічнай ідэнтыфікацыі. Сацыяльна-эканамічнае развіццё плямёнаў эпохі жалеза. Змены ў гаспадарцы і матэрыяльнай культуры.

**Тэма 1.1.4. Побыт, звычаі і мастацтва першабытных людзей.**

Уяўленні першабытных людзей аб навакольным асяроддзі. Звычаі і абрады, пахавальны абрад. Культ продкаў. Міфалогія. Старажытнае мастацтва. Музычныя інструменты. Змены ў матэрыяльнай і духоўнай культуры людзей першабытнага грамадства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

### ЧАСТКА 1.2. УЗНІКНЕННЕ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ КЛАСАВАГА ШМАТУКЛАДНАГА ГРАМАДСТВА І ДЗЯРЖАЎНАСЦІ (V-VI СТСТ. – ПЕРШАЯ ПАЛОВА XIII СТ.).

**Тэма 1.2.1. Насельніцтва беларускіх зямель у V — канцы IX ст.**

Балты на тэрыторыі Беларусі. Засяленне славянамі Беларусі. Славянізацыя балцкага насельніцтва. Аб'яднанні ўсходніх славян на беларускіх землях: крывічы-палачане, дрыгавічы, радзімічы. Грамадскі лад усходніх славян. Утварэнне суседскай (сельскай) абшчыны.

**Тэма 1.2.2. Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель у IX — сярэдзіне XIII ст. Зараджэнне феадальных адносін.**

Агульная характарыстыка феадалізму як грамадска-эканамічнай з’явы. Гаспадарчыя заняткі ўсходніх славян. Удасканальванне спосабаў апрацоўкі глебы і асноўных прылад працы. Расслаенне грамадства. Даніна і палюддзе. Складванне феадальных адносін. Асноўныя катэгорыі феадальназалежнага насельніцтва. Узнікненне і рост гарадоў. Структура гарадскога пасялення ў сярэдневякоўі. Рамесная вытворчасць і гандаль. Асноўныя гандлёвыя шляхі. Грашовае абарачэнне ў IX — XIII ст.ст. Роля гарадоў у грамадскім жыцці.

**Тэма 1.2.3. Дзяржаўнасць усходніх славян. Княствы на тэрыторыі Беларусі.**

Паходжанне дзяржаўнасці ўсходніх славян. Погляды гісторыкаў на праблему паходжання дзяржаўнасці і назвы “Русь”. Княствы на тэрыторыі Беларусі. Старажытнаруская дзяржава ўсходніх славян (Кіеўская Русь). Полацкае княства ў IX—XI стст. Узаемаадносіны Полацка з Ноўгарадам і Кіевам. Полацкая княжацкая дынастыя. Князь Усяслаў Брачыславіч. Княжацка-вечавы лад. Улада князя і яго абавязкі. Роля веча ў грамадскім жыцці. Тураўскае княства. Берасцейская зямля і Пасожжа.

**Тэма 1.2.4. Духоўная і матэрыяльная культура ўсходніх славян.**

Язычніцкія вераванні ва ўсходніх славян. Язычніцкі пантэон. Абрады і звычаі. Культ продкаў. Міфалогія ўсходніх славян. Народны каляндар. Матэрыяльная культура ўсходніх славян у V-IX стст. (жыллё, адзенне, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, зброя).

**Тэма 1.2.5. Прыняцце і распаўсюджванне хрысціянства ва Ўсходняй Еўропе.**

Сутнасць хрысціянства. Прыняцце хрысціянства як афіцыйнай рэлігіі на ўсходнеславянскіх землях. Прычыны прыняцця хрысціянства. Язычніцтва і хрысціянства. Спалучэнне хрысціянскіх і язычніцкіх вераванняў у народнай свядомасці, у традыцыях і абрадах. Значэнне прыняцця хрысціянства для ўсходніх славян. Рэлігійна-асветніцкія дзеячы: Ефрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі.

**Тэма 1.2.6. Культура беларускіх зямель у IX — сярэдзіне XIII ст.**

Развіццё пісьменнасці. Рукапісныя кнігі. Кніжная мініяцюра. Царкоўнае і абарончае дойлідства на тэрыторыі Беларусі. Фрэскавы жывапіс. Помнікі прыкладнога мастацтва. Паўсядзённае жыццё нашых продкаў (пасяленні і жыллё, харчаванне, сродкі зносін, ваенная справа і зброя, забавы.).

**Тэма 1.2.7. Беларускія землі ў канцы XII – першай палове XIII ст.**

Феадальная раздробленасць на беларускіх землях, узаемаадносіны паміж удзельнымі княствамі. Раздробленасць Полацкай зямлі ў XII — сярэдзіне XIII ст., прычыны і вынікі. Часовы ўздым Менскага княства. Адносіны паміж Полацкім і Кіеўскім княствамі. Феадальная раздробленасць Тураўскага княства. Княствы і гарады на тэрыторыі верхняга і сярэдняга Падняпроўя, Пасожжа, Пабужжа і Панямоння Палітыка полацкіх князёў у

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дачыненні да балцкіх плямёнаў. Агрэсія нямецкіх феадалаў-крыжакоў ва Ўсходняй Прыбалтыцы. Нашэсце мангола-татараў на Ўсходнюю і Цэнтральную Еўропу.

## РАЗДЗЕЛ ІІ. БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў СЯРЭДЗІНЕ XIII – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVI СТ.

### Тэма 2.1. Палітычная сітуацыя на беларускіх землях сярэдзіны XIII ст. Утварэнне Вялікага Княства Літоўскага.

Утварэнне Вялікага Княства Літоўскага. Вытокі ўтварэння ВКЛ. Знешнепалітычныя ўмовы ўзнікнення ВКЛ. Сацыяльна-эканамічныя прычыны ўтварэння ВКЛ. Літоўскія плямёны Верхняга Панямоння. Узвышэнне Навагрkörскага княства пры Міндоўгу. Унутрыпалітычнае і знешнепалітычнае становішча княства. Каранацыя Міндоўга ў Навагрудку. Княжанне нашчадкаў Міндоўга ў 2-ой палове XIII ст. Усходнеславянскі этнічны фундамент ВКЛ.

### Тэма 2.2. Унутрыпалітычнае становішча і знешняя палітыка ВКЛ у канцы XIII – 70-я гг. XIV ст.

Умацаванне ўлады вялікіх князёў літоўскіх. Княжэнне Віценя і Гедыміна. Славуты стараста Давыд Гарадзенскі. Альгерд і Кейстут. Пашырэнне тэрыторыі ВКЛ пры Альгердзе. Адносіны з Тэўтонскім Ордэнам (бітрва на р. Стрэве), Залатой Ардой (бітва на р. Сінія Воды), Маскоўскім княствам (паходы Альгерда на Маскву). Шляхі ўключэння беларускіх зямель у склад ВКЛ.

### Тэма 2.3. ВКЛ у канцы XIV – XV ст.: унутраная і знешняя палітыка.

Дынастычная барацьба ў 70—90-я гг. XIV ст. Барацьба Ягайлы за вялікае княжэнне. Узрастанне знешняй небяспекі. Крэўская унія. Знешняя і ўнутраная палітыка Вітаўта. «Вялікая вайна» супраць Ордэна. Грунвальдская бітва: вынікі і гістарычнае значэнне. Унутрыпалітычныя супярэчнасці паміж Свідрыгайлам і Жыгімонтам. Абранне Казіміра Ягайлавіча вялікім князем і яго палітыка.

### Тэма 2.4. Палітычнае становішча ВКЛ у першай палове XVI ст.

Праўленне Аляксандра і Жыгімонта І Старога. Пашырэнне правоў паноў-рады. Страта ВКЛ першынства ў збіранні “рускіх” зямель. Адносіны з Вялікім Княствам Маскоўскім. Абарона ад набегаў крымскіх татар. Выступленне М. Глінскага. Супярэчнасці паміж магнатамі і шляхтай.

### Тэма 2.5. Дзяржаўны лад, органы ўлады і кіравання ў ВКЛ.

Вышэйшыя органы ўлады і дзяржаўнага кіравання. Вялікі князь. Рада і сойм. Змены ў дзяржаўным ладзе ВКЛ у XV – XVI стст. Абмежаванне ўлады вялікага князя і павышэнне ролі магнатаў у кіраванні дзяржавай. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел ВКЛ у сярэдзіне XIII – XIV стст. Змены ў адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле ў XV – сярэдзіне XVI



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

стст. Сістэма мясцовых органаў кіравання. Войска. Заканадаўства ВКЛ. Статуты ВКЛ.

**Тэма 2.6. Эканамічнае развіццё і сацыяльныя адносіны ў ВКЛ у XIV – першай палове XVI ст.**

Стан сельскай гаспадаркі, удасканальванне прылад працы. Сельскія пасяленні. Землеўладанне і землекарыстанне. Павіннасці сялян. Этапы запрыгоньвання сялянства. Судзебнік Казіміра IV. Гарады і мястэчкі. Гістарычная роля сярэдневяковага горада. Магдэбургскае права. Рамяство і гандаль. Спецыяльнасці рамеснікаў і іх вырабы. З'яўленне цэхаў. Саслоўная структура грамадства ў ВКЛ.

**Тэма 2.7. Культура Беларусі ў другой палове XIII — першай палове XVI ст.**

Абарончае дойлідства. Культавыя пабудовы. Жывапіс і скульптура. Пачатак беларуска-літоўскага летапісання. Эпоха Адраджэння ў Еўропе, яе этапы і галоўныя дасягненні. Рэнесансавая культура ў Беларусі. Літаратура. З'яўленне новалацінскай паэзіі. М. Гусоўскі. Францыск Скарына — усходнеславянскі і беларускі гуманіст і асветнік. Погляды Ф. Скарыны і яго друкарская дзейнасць.

**Тэма 2.8. Фарміраванне беларускай народнасці.**

Шматэтнічны характар ВКЛ (татары, яўрэі, цыгане). Асаблівасці фарміравання беларускага этнасу. З'яўленне старабеларускай мовы. Асаблівыя рысы беларускага нацыянальнага характару. Рэлігійная талерантнасць. Фарміраванне этнічнай тэрыторыі. Паходжанне назвы "Белая Русь".

**РАЗДЗЕЛ III. БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVI — XVIII СТ.**

**Тэма 3.1. Утварэнне Рэчы Паспалітай. Становішча Вялікага Княства Літоўскага ў палітычнай сістэме Рэчы Паспалітай.**

Унутры- і знешнепалітычныя прычыны аб'яднання ВКЛ з Польшчай. Лівонская вайна. Люблінскі сойм. Умовы аб'яднання ВКЛ з Каралеўствам Польскім. Далучэнне да Польшчы часткі зямель ВКЛ. Распрацоўка і прыняцце Статута 1588 г. Леў Сапега. Захаванне агульнадзяржаўных соймаў ВКЛ. Утварэнне Галоўнага трыбунала. Паланізацыя шляхты ВКЛ.

**Тэма 3.2. Сельская гаспадарка і гарадское жыццё ў ВКЛ у другой палове XVI — XVII ст.**

Уплыў гаспадарчых працэсаў у краінах Заходняй Еўропы на эканоміку ВКЛ. Станаўленне фальваркова-паншчыннай сістэмы гаспадарання. Аграрная рэформа 1557 г. Павіннасці сялян. Запрыгоньванне сялянства. Сацыяльныя супярэчнасці ў вёсцы. Стан гарадоў і іх гандлёвыя сувязі. Юрыдыкі. Мястэчкі. Цэхі. Гандаль. Сацыяльныя канфлікты ў горадзе.

**Тэма 3.3. Царква і рэлігія на беларускіх землях у XVI — першай палове XVII ст.**



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Канфесійнае становішча ў ВКЛ. Рэлігійная верацярпімасць. Традыцыйнае хрысціянства: праваслаўе і каталіцызм. Крызіс праваслаўнай царквы. Передумовы рэфармацыйнага руху. Асаблівасці Рэфармацыі на беларускіх землях. Дзеячы Рэфармацыі: Мікалай Радзівіл Чорны, Сымон Будны, Васіль Цяпінскі. Вынікі і значэнне Рэфармацыі. Контррэфармацыя. П. Скарга. Дзейнасць Ордэна езуітаў на тэрыторыі Беларусі. Берасцейскі царкоўны сабор 1596 г. Уніяцкая царква.

**Тэма 3.4. Знешняя палітыка Рэчы Паспалітай у канцы XVI – першай палове XVII ст.**

Завяршэнне Лівонскай вайны. Заключэнне і ўмовы Ям-Запольскага міру (1582 г.). Барацьба са Швецыяй за Прыбалтыку. Альтмарскі мірны договор 1629 г. Інтэрвенцыя Рэчы Паспалітай у Расійскую дзяржаву. Дэўлінскае перамір'е (1618 г.). Барацьба за Смаленск у 30-я гг. XVII ст. Палянаўскі мірны дагавор 1634 г.

**Тэма 3.5. Беларусь у час войнаў сярэдзіны XVII ст.**

Казацка-сялянская вайна 1648—1651 гг.: прычыны і характар вайны. Казацкія загоны ў Беларусі. Вынікі антыфеадальнай барацьбы. Вайна Расіі і Рэчы Паспалітай 1654—1667 гг. Прычыны вайны. Палітыка расійскіх уладаў на беларускіх землях. Адносіны насельніцтва да варагуючых бакоў. Вынікі вайны для беларускіх зямель. Вайна са Швецыяй 1655-1660 гг.

**Тэма 3.6. Беларусь у час войнаў у пршай палове XVIII ст.**

Передумовы, прычыны і пачатак Паўночнай вайны 1700—1721 гг. Баявыя дзеянні на тэрыторыі Беларусі. Бітва каля в. Лясная. Вынікі і наступствы Паўночнай вайны для Беларусі. "Нямы сойм" 1717 г.

**Тэма 3.7. Сацыяльна-эканамічнае становішча Беларусі ў XVIII ст.**

Уплыў войнаў XVII ст. на эканамічнае развіццё беларускіх зямель. Становішча ў весцы. Павіннасці сялян і іх юрыдычнае становішча. Формы антыфеадальнай барацьбы. Сялянскія паўстанні. Становішча гарадоў. Самакіраванне. Рамесная і мануфактурная вытворчасць. Гандлёвыя сувязі. Эканамічная стабілізацыя ў 2-ой палове XVIII ст.

**Тэма 3.8. Палітычны крызіс Рэчы Паспалітай і яе падзелы.**

Паслабленне цэнтральнай улады і шляхецкая анархія. Барацьба магнацкіх груповак. Феадальная вайна ў Рэчы Паспалітай 1697-1702 гг. Умяшальніцтва суседніх дзяржаў ва ўнутраныя справы РП. Вайна за "Польскую спадчыну" (1733-1739). Спробы рэформаў. Першы падзел РП. Канстытуцыя 3 мая 1791 г. Другі падзел РП. Паўстанне пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі: прычыны, характар, вынікі. Я. Ясінскі, М. Клеафас Агінскі. Трэці падзел РП. Уваходжанне беларускіх зямель ў склад Расійскай імперыі.

**Тэма 3.9. Адукацыя і навука Беларусі ў другой палове XVI — XVIII ст.**

Сістэма адукацыі: каталіцкія, пратэстанцкія, праваслаўныя школы. Віленская акадэмія. Пашырэнне ідэй Асветніцтва на тэрыторыі Беларусі. Асаблівасці Асветніцтва ў Беларусі. Адукацыйная камісія. Сістэма адукацыі на беларускіх землях у XVIII ст. Стварэнне прафесійных навучальных

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

устаноў. Навука: К. Семяновіч, І. Капіевіч, М. Пачобут-Адляніцкі, А. Нарушэвіч і інш.

**Тэма 3.10. Культура Беларусі ў другой палове XVI — XVIII ст. Уплыў Асветніцтва.**

Рэнесанс у другой палове XVI — першай палове XVII ст. Кнігадрукаванне. Грамадска-палітычная думка. Літаратура. Сімяон Полацкі. Рэнесансавы характар палацава-замкавага будаўніцтва. Стыль барока ў архітэктуры. Віленскае барока. Жывапіс. «Сармацкі партрэт». Віленская мастацкая школа. Музычнае мастацтва. «Полацкі сшытак». Батлейка. Тэатральнае мастацтва. Асветніцтва. Дзейнасць беларускіх майстроў-рамеснікаў. Асаблівасці развіцця народнай культуры.

## РАЗДЗЕЛ IV. БЕЛАРУСЬ У XIX — ПАЧАТКУ XX СТ.

**Тэма 4.1. Грамадска-палітычнае становішча ў Беларусі ў першай палове XIX ст.**

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел беларускіх зямель. Саслоўная і канфесійная палітыка расійскага ўрада. Абмежавальныя законы ў адносінах да яўрэяў, абмежаванне ўплыву каталіцкага духавенства. Ваенныя пасяленні. Беларусь у час вайны 1812 г. Палітыка французскіх акупацыйных улад, выгнанне французаў. Спробы аднаўлення ВКЛ. Вынікі вайны для Беларусі.

**Тэма 4.2. Грамадска-палітычны рух у Беларусі ў першай палове XIX ст.**

Стварэнне і дзейнасць тайных арганізацый у Беларусі. Польскія і расійскія дваранскія рэвалюцыянеры ў Беларусі. Уплыў паўстання 1830—1831 гг. на грамадска-палітычны рух у Беларусі. Змены ў палітыцы самадзяржаўя пасля падаўлення шляхецкага паўстання. Канфесійныя адносіны. Скасаванне ўніяцкай царквы. Дэмакратызацыя грамадскага руху. Уплыў рэвалюцыйных падзей 1848-49 гг. на грамадска-палітычны рух у Беларусі.

**Тэма 4.3. Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель у першай палове XIX ст.**

Землеўладанне і памешчыцкая гаспадарка. Становішча сялян і іх павіннасці. Крызіс феадальна-прыгонніцкай сістэмы гаспадарання. Рэформа П. Дз. Кісялёва ў дзяржаўнай вёсцы. Інвентарная рэформа. Развіццё прамысловасці. Формы прамысловай вытворчасці і пачатак прамысловага пераварота. Развіццё шляхоў зносін і гандлю. Роля кірмашоў. Гарады і мястэчкі Беларусі.

**Тэма 4.4. Культура Беларусі ў першай палове XIX ст.**

Асветніцтва і рамантызм. Змены ў сістэме адукацыі. Тыпы школ. Вышэйшыя навучальныя ўстановы. Станаўленне навуковых ведаў пра Беларусь і беларускі народ. Браты Тышкевічы, Я. Чачот. Літаратура. Станаўленне беларускай літаратурнай мовы. А. Міцкевіч. Я. Баршчэўскі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У. Сыракомля, В. Дунін-Марцінкевіч, П. Багрым. Тэатр і музыка. С. Манюшка. Жывапіс. І. Хруцкі, В. Ваньковіч. Архітэктура.

**Тэма 4.5. Адмена прыгоннага права. Асаблівасці буржуазных рэформаў другой паловы XIX ст. у Беларусі.**

Асаблівасці пераходу ад феадальнага да буржуазнага грамадства на беларускіх землях. Маніфест і Палажэнні 19 лютага 1861 г., асаблівасці іх прымянення ў Беларусі. Рэакцыя сялянства. Уплыў паўстання 1863—1864 гг. на ўмовы вызвалення сялян. Вынікі і значэнне рэформы 1861 г. Правядзенне іншых буржуазна-дэмакратычных рэформ Аляксандра II. Контррэформы Аляксандра III.

**Тэма 4.6. Грамадска-палітычны рух у другой палове XIX — пачатку XX ст. у Беларусі.**

Паўстанне 1863–1864 гг. “Белая” і “чырвоная” плыні ў паўстанні. Праграма К. Каліноўскага. Вынікі паўстання для Беларусі. Урадавая палітыка ў Беларусі ў апошняй трэці XIX ст. Рэвалюцыйныя народнікі. Група “Гоман”. Сацыял-дэмакратычныя арганізацыі. І З’езд РСДРП. Утварэнне БСГ, яе праграмныя потрабаванні.

**Тэма 4.7. Развіццё сельскай гаспадаркі ў Беларусі ў другой палове XIX — пачатку XX ст.**

Рост буржуазнага землеўладання і асаблівасці гэтага працэсу ў Беларусі. Пераход да прадпрымальніцкай гаспадаркі. Спецыялізацыя сельскай гаспадаркі. Становішча сялян, іх сацыяльная дыферэнцыяцыя. Формы і характар сялянскай барацьбы. Прычыны і мэты сталыпінскія аграрнай рэформы. Хутар і водруб. Арганізацыя перасялення сялян у азіяцкую частку Расіі. Разбурэнне сялянскай абшчыны. Асаблівасці правядзення земскай рэформы. Вынікі рэформаў для Беларусі.

**Тэма 4.8. Развіцце капіталізму ў прамысловасці Беларусі ў другой палове XIX — пачатку XX ст.**

Станаўленне фабрычнай вытворчасці. Спецыялізацыя прамысловасці і яе асноўныя галіны. Асаблівасці прамысловага перавароту ў Беларусі. Рост гарадоў. Змены ў складзе гарадскога насельніцтва. Асаблівасці ў фарміраванні пралетарыяту і буржуазіі ў Беларусі. Развіццё ўнутранага і знешняга гандлю. Будаўніцтва чыгунак. Станаўленне банкаў. Уздым рабочага руху ў канцы XIX ст.

**Тэма 4.9. Беларусь у перыяд першай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі (1905—1907 гг.)**

Прычыны рэвалюцыі. Выступленні рабочых і сялян. Маніфест 17 кастрычніка 1905 г. і яго наступствы для Беларусі. Лагеры ў грамадска-палітычнай барацьбе: асноўныя палітычныя партыі і арганізацыі, іх праграмныя патрабаванні па нацыянальным, аграрным пытаннях, па пытанні аб уладзе. Дэпутаты ад заходніх губерняў у Дзяржаўнай думе. Беларускі нацыянальны рух. Праграмныя патрабаванні Беларускай сацыялістычнай грамады.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Тэма 4.10. Становішча Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны.**

Пачатак вайны. Адносіны грамадства да ўдзелу краіны ў I Сусветнай вайне. Увядзенне ваеннага становішча. Акупацыя заходняй часткі Беларусі германскімі войскамі. Палітыка нямецкіх улад. Наступствы ваенных дзеянняў. Бежанства. Заняпад сельскай гаспадаркі. Рост антываенных і антыўрадавых настрояў. Беларускі нацыянальны рух.

**Тэма 4.11. Беларусь у перыяд Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г.**

Прычыны рэвалюцыі. Звяржэнне самадзяржаўя. Фарміраванне Саветаў і буржуазных органаў улады. Двоеўладдзе. Дэмакратызацыя арміі. Дзейнасць палітычных партый і арганізацый. Значэнне рэвалюцыйных падзей для буржуазна-дэмакратычнага развіцця беларускага грамадства. Ліпеньскі палітычны крызіс. Канец двоеўладдзя. Беларускі нацыянальны рух у 1917 г. Карнілаўскі мяцеж.

**Тэма 4.12. Культура Беларусі ў другой палове XIX — пачатку XX ст. Фарміраванне беларускай нацыі.**

Умовы і асаблівасці фарміравання беларускай нацыі. Этнічная тэрыторыя. Нацыянальны і сацыяльны склад насельніцтва Беларусі. Нацыянальнае пытанне і фарміраванне самасвядомасці беларусаў. Фарміраванне беларускай нацыянальнай ідэі. Роля газеты «Наша ніва» ў развіцці культуры Беларусі. Заходнерусізм. М. Каяловіч.

**Тэма 4.13. Культура Беларусі ў другой палове XIX — пачатку XX ст.**

Школьная рэформа 60-х гг. XIX ст. Змены ў сістэме адукацыі ў наступныя гады. Навуковыя даследаванні аб мове, этнаграфіі беларусаў, гісторыі Беларусі. І. Насовіч. Я. Карскі, М. Доўнар-Запольскі, В. Ластоўскі. Развіццё беларускай літаратурнай мовы і літаратуры. Кірункі творчасці Ф. Багушэвіча, Я. Лучыны, Цёткі, Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча. Станаўленне беларускага прафесійнага тэатра. І. Буйніцкі. Жывапіс: К. Альхімовіч, Н. Орда, Н. Сіліcarновіч, В. Бялыніцкі-Біруля. Развіццё архітэктуры.

## РАЗДЗЕЛ V. БЕЛАРУСЬ У 1917—1945 ГГ.

### ЧАСТКА 5.1. БЕЛАРУСЬ У 1917–1939 ГГ.

**ТЭМА 5.1.1. КАСТРЫЧНІЦКАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ Ў БЕЛАРУСІ І ЎСТАНАЎЛЕННЕ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ.**

Нарастанне супярэчнасцей у грамадстве. Кастрычніцкае ўзброенае паўстанне ў Петраградзе. Рашэнні II Усерасійскага з’езда Саветаў і іх роля ва ўсталяванні новай рэвалюцыйнай улады. Пераход улады ў рукі Саветаў на Заходнім фронце і ў Беларусі. Утварэнне Абласнога выканаўчага камітэта Заходняй вобласці і фронту. Першыя пераўтварэнні савецкай улады. Палітыка «ваеннага камунізму» і асаблівасці яе правядзення ў Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Тэма 5.1.2. Абвяшчэнне і ўтварэнне беларускай дзяржаўнасці.**

Пазіцыя бальшавікоў па нацыянальным пытанні. Беларускі нацыянальны рух і яго асноўныя палітычныя напрамкі. Скліканне Усебеларускага з’езда, яго рашэнні і роспуск. Наступленне войск кайзераўскай Германіі. Брэсцкі мір і яго вынікі для Беларусі. Барацьба супраць германскіх акупантаў. Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі. Дзейнасць Рады БНР. Вывад нямецкіх войск. Утварэнне Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусь. Першы Усебеларускі з’езд Саветаў і яго рашэнні. Абвяшчэнне Літбел.

**Тэма 5.1.3. Барацьба з польскай інтэрвенцыяй. Другое абвяшчэнне БССР.**

Наступленне польскіх войск і пачатак савецка-польскай вайны. Устанаўленне польскага акупацыйнага рэжыму, арганізацыя барацьбы з ім. Вызваленне войскамі Чырвонай Арміі тэрыторыі Беларусі ад польскіх акупантаў. Рыжскі мірны дагавор і яго вынікі для Беларусі. Другое абвяшчэнне ССРБ.

**Тэма 5.1.4. БССР у гады новай эканамічнай палітыкі.**

Сацыяльна-эканамічнае становішча Беларусі пасля Першай сусветнай і грамадзянскай войнаў. Увядзенне новай эканамічнай палітыкі. Уплыў нэпа на пад’ём сельскай гаспадаркі, развіццё прамысловасці і гандлю. Асаблівасці нэпа ў Беларусі. Прычыны згортвання нэпа.

**Тэма 5.1.5. Грамадска-палітычнае жыццё БССР у гады нэпа.**

Дзейнасць грамадскіх арганізацый. Палітычная барацьба. Устанаўленне аднапартыйнай сістэмы. Удзел БССР ва ўтварэнні Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Узбуйненні тэрыторыі БССР у 1924 і 1926 гг. Падрыхтоўка і прыняцце Канстытуцыі БССР 1927 г.

**Тэма 5.1.6. Палітыка беларусізацыі. Развіццё адукацыі, навукі і культуры ў БССР у 1920-я гг.**

Палітыка беларусізацыі. Асноўныя напрамкі і мерапрыемствы беларусізацыі, яе вынікі і значэнне. Каранізацыя. Меры па ліквідацыі непісьменнасці. Станаўленне і развіццё сістэмы адукацыі ў БССР. Інстытут беларускай культуры. Утварэнне Беларускай Акадэміі навук.

**Тэма 5.1.7. БССР у канцы 1920-х — 1930-я гг.**

Пераход да планавай дзяржаўнай эканомікі. Асаблівасці правядзення індустрыялізацыі ў БССР і яе вынікі. Погляды на шляхі пераўтварэнняў у сельскай гаспадарцы, формы кааперавання сялянскіх гаспадарак. Калектывізацыя сельскай гаспадаркі ў БССР: тэмпы, метады і вынікі калгаснага будаўніцтва. Грамадска-палітычнае жыццё. Канстытуцыя БССР 1937 г. Роля Камуністычнай партыі і Саветаў у грамадска-палітычным жыцці. Палітычныя рэпрэсіі.

**Тэма 5.1.8. Беларуская савецкая культура ў 1920—1930-я гг.**

Станаўленне і развіццё сістэмы адукацыі ў БССР. Увядзенне ўсеагульнай пачатковай адукацыі. Даследаванні беларускага этнасу, яго гісторыі і культуры. Развіццё навукі. Асноўныя напрамкі і тэмы ў творчасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

беларускіх пісьменнікаў. Я. Купала, Я. Колас, М. Гарэцкі, П. Глебка, М. Лынькоў, К. Чорны. Станаўленне беларускага савецкага тэатра: Я.Міровіч, У. Галубок. Тэатральнае і музычнае мастацтва: К. Крапіва, Г. Глебаў, А. Багатыроў. Станаўленне беларускага кіно. Ю. Тарыч, У. Корш-Саблін. Вядучыя тэмы выяўленчага мастацтва: М. Філіповіч, В. Волкаў, І. Ахрэмчык, У. Кудрэвіч. Архітэктура і скульптура. І. Лангбард, Г. Лаўроў, З. Азгур.

**Тэма 5.1.9. Становішча Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы.**

Палітычныя і сацыяльна-эканамічныя ўмовы жыцця заходнебеларускага насельніцтва. Насаджэнне асадніцтва. Нацыянальна-культурны ўціск. Нацыянальна-вызваленчы рух. Дзейнасць Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі. Беларуская сялянска-работніцкая грамада. Дзейнасць Таварыства беларускай школы. Стан культуры ў Заходняй Беларусі. Адукацыя. Літаратура: П. Пестрак, М. Танк. Жывапіс: Я. Драздовіч, П. Сергіевіч. Музычнае мастацтва. Р. Шырма. Становішча канфесій.

## ЧАСТКА 5.2. БЕЛАРУСЬ У ГАДЫ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ 1939–1945 ГГ.

**Тэма 5.2.1. Пачатак Другой сусветнай вайны. Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР.**

Прычыны і характар вайны. Нападзенне Германіі на Польшчу. Паход Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь. Уз'яднанне заходнебеларускіх зямель з БССР, грамадска-палітычныя, сацыяльна-эканамічныя і культурныя пераўтварэнні. БССР напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны.

**Тэма 5.2.2. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Нямецка-фашысцкі акупацыйны рэжым у Беларусі.**

Нападзенне Германіі на СССР. Абарончыя баі ў Беларусі і іх вынікі. Гераізм і патрыятызм савецкіх людзей. Прычыны адступлення савецкіх войск. Чырвонай Арміі на першым этапе вайны. Устанаўленне нямецка-фашысцкага акупацыйнага рэжыму на тэрыторыі Беларусі. Акупацыйная палітыка. Палітыка генацыду. Калабарацыянізм.

**Тэма 5.2.3. Барацьба беларускага народа супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў.**

Роля КП(б)Б у арганізацыі барацьбы з нямецка-фашысцкімі акупантамі. Стварэнне партызанскіх атрадаў. В. Корж, Ф. Паўлоўскі, Ц. Бумажкоў, М. Шмыроў. Партыйнае і камсамольска-маладзёжнае падполле. Баявая дзейнасць партызанскіх фарміраванняў. Партызанскія зоны. "Рэйкавая вайна". Партыйнае і маладзёжна-камсамольскае падполле. Масавае супраціўленне мірнага насельніцтва акупацыйнаму рэжыму.

**Тэма 5.2.4. Вызваленне БССР ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Заканчэнне Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў.**

Пачатак вызвалення БССР. Беларуская наступальная аперацыя "Баграціён". Дапамога партызан і насельніцтва Чырвонай Арміі. Вызваленне Мінска. Подзвігі савецкіх воінаў. Значэнне разгрому гітлераўцаў у Беларусі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Капітуляцыя Германіі. Заканчэнне Другой сусветнай вайны. Беларусы і ўраджэнцы Беларусі на франтах Вялікай Айчыннай вайны. Уклад беларускага народа ў перамогу над фашысцкай Германіяй. Вытокі патрыятызму беларускага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

## РАЗДЗЕЛ VI. БССР У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 1940-Х — 1980-Я ГГ.

### Тэма 6.1. БССР у 1945—1953 гг. Удзел БССР у заснаванні ААН.

Людскія і матэрыяльныя страты, якія прычыніла вайна і фашысцкая акупацыя Беларусі. Пасляваеннае аднаўленне народнай гаспадаркі. Працоўны подзвіг беларускага народа. Паскарэнне тэмпаў індустрыялізацыі БССР. Апераджальны рост цяжкай прамысловасці. Становішча ў сельскай гаспадарцы і меры па яе аднаўленні. Ажыццяўленне масавай калектывізацыі ў заходніх абласцях Беларусі. Выхад БССР на міжнародную арэну. Уключэнне БССР ў склад краін-заснавальніц ААН.

### Тэма 6.2. Грамадска-палітычнае і культурнае жыццё БССР у 1945—1953 гадах.

Асаблівасці грамадска-палітычнага жыцця ў БССР пасля заканчэння вайны. Аднаўленне працы адукацыйных устаноў. Увядзенне ўсеагульнага сямігадовага навучання. Тэма вайны ў беларускай літаратуры. І. Шамякін, М. Лынькоў, І. Мележ. Творчасць Я. Коласа, Я. Брыля, П. Броўкі, М. Танка, А. Куляшова. Беларускі тэатр. Музыка і мастацтва.

### Тэма 6.3. Сацыяльна-эканамічнае развіццё БССР у другой палове 1950-х — першай палове 1980-х гг.

Развіццё машынабудавання і металаапрацоўкі, хімічнай і нафтахімічнай прамысловасці. Фарміраванне прамысловага комплексу БССР. Пераўтварэнне БССР у індустрыяльна развітую краіну. Асноўныя прынцыпы эканамічнай рэформы 1965 г. Экстэнсіўны характар гаспадаркі. Асаблівасці выкарыстання дасягненняў навукова-тэхнічнай рэвалюцыі ў БССР. Урбанізацыя і яе вынікі. Развіццё сельскай гаспадаркі: меліярацыя і хімізацыя, будаўніцтва буйных жывёлагадоўчых комплексаў. Курс на стварэнне аграпрамысловых комплексаў. Змяненне ўмоў жыцця насельніцтва. Замаруджванне тэмпаў росту народнай гаспадаркі ў першай палове 1980-х гг. Наспяванне крызісных з’яў у эканоміцы.

### Тэма 6.4. Грамадска-палітычнае жыццё ў БССР у другой палове 1950-х — першай палове 1980-х гг.

Асуджэнне культу асобы Сталіна. Спробы дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця ў гады “адлігі”. Частковая рэабілітацыя. Павышэнне ролі працоўных у жыцці грамадства. Савецкая грамадска-палітычная сістэма ў другой палове 1960-х — першай палове 1980-х гг. К. Мазураў, П. Машэраў. Канстытуцыйнае замацаванне кіруючай ролі камуністычнай партыі. Роля Саветаў у грамадска-палітычным жыцці краіны. Палітыка дзяржавы ў адносінах да канфесій.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Тэма 6.5. БССР у другой палове 1980-х гг.**

Палітыка “перабудовы” і асаблівасці яе правядзення ў БССР. Увядзенне ў краіне галоснасці. Рэфармаванне савецкай палітычнай сістэмы. Выбары народных дэпутатаў у Вярхоўны Савет БССР і мясцовыя Саветы на альтэрнатыўнай аснове. Пачатак фарміравання шматпартыйнасці. Грамадскія арганізацыі і аб’яднанні. Паглыбленне крызісных з’яў у эканоміцы. Спробы паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Перавод прадпрыемстваў на самафінансаванне і гаспадарчы разлік. Уплыў аварыі на Чарнобыльскай АЭС на эканамічнае становішча БССР. Пагаршэнне становішча ў эканоміцы. Змены ў дабрабыце народа.

**Тэма 6.6. Развіццё адукацыі і навукі, літаратуры і мастацтва ў БССР у другой палове 1950-х — 1980-я гг.**

Рэформа школы і пераход да абавязковага 8-гадовага навучання. Увядзенне ўсеагульнай сярэдняй адукацыі. Пашырэнне сістэмы прафесійна-тэхнічнага навучання. Развіццё вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Дасягненні ў развіцці навукі. Інтэграванасць беларускай навукі ў агульнасаюзную. Уплыў грамадска-палітычнага жыцця на беларускую літаратуру. Адлюстраванне гістарычных падзей у творчасці У. Караткевіча. Распрацоўка тэмы вайны ў творах І. Шамякіна, В. Быкава, І. Навуменкі, А. Адамовіча. Жыццёвыя лёсы беларусаў у творчасці І. Мележа. Беларуская паэзія. Новыя з’явы ў беларускай літаратуры ў гады перабудовы. Творчыя дасягненні дзеячаў тэатральнага, музычнага і выяўленчага мастацтва Беларусі. Кіно. Скульптура. Архітэктура.

## РАЗДЗЕЛ VII. РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ У 1991—2016 ГГ.

**Тэма 7.1. Абвяшчэнне і станаўленне дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь.**

Рух за нацыянальнае адраджэнне і дзяржаўны суверэнітэт ў Беларусі. Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце БССР 27 ліпеня 1990 г. Закон Вярхоўнага Савета БССР ад 25 жніўня 1991 г. “Аб забеспячэнні палітычнай і эканамічнай самастойнасці БССР”. Прыняцце 19 верасня 1991 г. назвы Рэспубліка Беларусь. Белавежскае пагадненне 8 снежня 1991 г. Стварэнне Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 15 сакавіка 1994 г. Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Першы Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка. Рэспубліканскі рэферэндум 1995 г. і яго вынікі. Дзяржаўная сімволіка Рэспублікі Беларусь.

**Тэма 7.2. Грамадска-палітычнае жыццё ў Рэспубліцы Беларусь у другой палове 1990-х гг. — пачатку XXI ст.**

Умацаванне палітычнай сістэмы ў Рэспубліцы Беларусь. Рэспубліканскі рэферэндум 24 лістапада 1996 г. і яго вынікі. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 г. (са зямяненнямі і дапаўненнямі). Канстытуцыйны лад Рэспублікі Беларусь. Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2001, 2006, 2010, 2015 гг.). Рэспубліканскі рэферэндум 2004 г. Асновы ідэалогіі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

беларускай дзяржавы. Палітычныя партыі і грамадскія арганізацыі. Канфесіянальная палітыка дзяржавы.

**Тэма 7.3. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Рэспублікі Беларусь.**

Эканамічнае становішча Рэспублікі Беларусь у першай палове 1990-х гг. Пошук шляхоў пераходу да рынку. Прыватызацыя. Распрацоўка нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага развіцця краіны. Галоўныя мэты і асноўныя элементы беларускай мадэлі сацыяльна арыентаванай рыначнай эканомікі, сродкі яе рэалізацыі і дасягненні. Змены ў дабрабыце насельніцтва. Эканамічная інтэграцыя з Расіяй і краінамі СНД. Дзяржаўная маладзёжная палітыка. Сусветны фінансава-эканамічны крызіс і шляхі пераадолення яго наступстваў у Рэспубліцы Беларусь. Развіццё міжнароднага эканамічнага супрацоўніцтва.

**Тэма 7.4. Міжнароднае становішча і знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь.**

Фарміраванне і прыярытэты знешнепалітычнага курсу Рэспублікі Беларусь. Прыхільнасць Беларусі прынцыпам Статута ААН, дзейнасць Беларусі ў ААН. Шматвектарнасць знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь. Умацаванне сувязей з краінамі СНД. Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі. Еўразійскі эканамічны саюз. Узаемаадносіны з краінамі Еўрасаюза і НАТА, развіццё міжнароднага супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь

**Тэма 7.5. Развіццё адукацыі, навукі і культуры ў Рэспубліцы Беларусь.**

Змены ў адукацыйнай сістэме. Дасягненні беларускай навукі і яе роля ў фарміраванні інфармацыйнага грамадства. Літаратура. С. Алексіевіч. Адлюстраванне ў мастацтве гістарычнага мінулага беларускага народа. Творчыя дасягненні дзеячаў тэатральнага, музычнага і выяўленчага мастацтва Беларусі. Архітэктура. Дасягненні беларускіх спартсменаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### СРОДКІ ДЫЯГНОСТЫКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Асноўным сродкам дыягностыкі засваення ведаў і фарміравання неабходных уменняў і навыкаў па дысцыпліне "Гісторыя Беларусі" з'яўляецца праверка заданнняў рознага тыпу, якія выконваюцца слухачамі ў рамках гадзін, адведзеных на вывучэнне кожнай тэмы і кожнага раздзелу (змест вучэбнага матэрыялу дысцыпліны структурыраваны па раздзелам і тэмам). Для дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці выкарыстоўваюцца вусныя адказы слухачоў, франтальны апрос па пройдзенай тэме, напісанне прамежкавых кантрольных і заліковых кантрольных работ (у абсалютнай большасці – гэта выкананне слухачамі тэставых заданняў).

Ацэнка вынікаў вучэбнай дзейнасці адбываецца па дзесяцібальнай шкале адпаведна тым крытэрыям, што ўстаноўлены для абітурыентаў па дысцыпліне "Гісторыя Беларусі" Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Адзнака 0 (нуль) баллаў выстаўляецца пры адмове ад адказу.

Ацэнка вуснага адказу слухача на занятках ажыццяўляецца адпаведна наступным паказчыкам:

| Баллы | Паказчыкі ацэнкі |
|---|---|
| 1 | Пазнаванне асобных аб'ектаў вывучэння (паняццяў, гістарычных падзей, з'яў, працэсаў, персоналий) праграмнага вучэбнага матэрыялу па прад'яўленаму апісанню |
| 2 | Распазнаванне аб'ектаў вывучэння (паняццяў, гістарычных падзей, з'яў, працэсаў, персоналий) праграмнага вучэбнага матэрыялу па прад'яўленаму апісанню |
| 3 | Перадача часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу па памяці: фрагментарны пераказ і пералік асобных паняццяў, гістарычных падзей, з'яў, працэсаў, персоналий без тлумачэння |
| 4 | Перадача праграмнага вучэбнага матэрыялу па памяці: вызначэнне паняццяў, апісанне гістарычных падзей, з'яў, працэсаў з указаннем агульных і с указанием агульных і адметных знешніх прыкмет без іх тлумачэння, асноўных біяграфічных звестак і дзейнасці гістарычных персаналій |
| 5 | Свядомая перадача значнай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу: характарыстыка вывучаемых аб'ектаў па плану (памятке); самостойнае ажыццяўленне спосабаў вучэбна-пазнаваўчай дзейнасці па ўзору |
| 6 | Свядомая перадача ў поўным памеры праграмнага вучэбнага матэрыялу: правільнае выкарыстанне тэрміналогіі, апісанне гістарычных падзей, з'яў. працэсаў з элементамі тлумачэння, якія раскрываюць прычынна-выніковыя сувязі, адносіны, самастойнае ажыццяўленне спосабаў дзейнасці па ўзору |
| 7 | Валоданне і аперыраванне праграмным вучэбным матэрыялам у |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| Баллы | Паказчыкі ацэнкі |
|---|---|
| | знакомай сітуацыі: канкрэтызацыя паняццяў, вывадаў прыкладамі; аналіз гістарычных падзей, з'яў, працэсаў з мэтай тлумачэння прычынна-выніковых сувязей, вывадаў; самастойнае выкананнне заданняў па алгарытму |
| 8 | Свабоднае валоданне і аперыраванне праграмным вучэбным матэрыялам у знаёмай сітуацыі: аналіз гістарычных падзей, з'яў, працэсаў з мэтай тлумачэння прычынна-выніковых сувязей, вывадаў; абагульненне вывучаемага матэрыялу; абаснаванне і доказ; раскрыццё сутнасці вывучаемых з'яў і працэсаў; выкарыстанне ўнутрыпрадметных сувязей; самастойнае выкананнне заданняў па алгарытму |
| 9 | Аперыраванне праграмным вучэбным матэрыялам, ажыццяўленне спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці ў невядомай сітуацыі; выкарыстанне міжпрадметным сувязей; ацэнка гістарычных фактаў на падставе вывучаемага матэрыялу; выкананне задач і заданняў праблемнага характару |
| 10 | Свабоднае аперыраванне праграмным вучэбным матэрыялам, ажыццяўленне спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці ў невядомай сітуацыі; самастойнае выкананне задач і заданняў праблемнага характару; выкананне творчых заданняў і работ |

Пад час выстаўлення ацэнкі па гісторыі Беларусі ўлічваецца ступень засваення слухачамі асноўных кампанентаў гістарычных ведаў: *фактaлагічных*, якія ўключаюць веды аб канкрэтных гістарычных фактах (падзеях, з'явах, працэсах), лакалізаваных ў часе і прасторы; *тэарэтычных*, якія ўключаюць у сябе паняцці рознай ступені абагульненасці, істотныя прычынна-выніковыя сувязі, якія раскрываюць абумоўленасць гістарычных падзей, з'яў, працэсаў, тэндэнцыі і заканамернасці гістарычнага развіцця; *спосабы вучэбна-пазнавальнай дзейнасці*, якія дазваляюць аперваць тэарэтычнымі і фактaлагічных ведамі, валодаць картаграфічнымі ўменнямі, працаваць з крыніцамі гістарычнай інфармацыі; *ацэначныя веды*, якія ўключаюць у сябе веданне розных пунктаў гледжання на гістарычныя падзеі і дзейнасць іх удзельнікаў. <u>Асноўнымі змястоўнымі лініямі з'яўляюцца:</u> гістарычны час, гістарычная прастора і гістарычнае развіццё. Ступень засваення змястоўнага кампанента ацэньваецца на аснове такіх крытэрыяў, *як дакладнасць, правільнасць, асэнсаванасць, паўната, абагульненасць, сістэмнасць, трываласць, мабільнасць, дзейснасць, самастойнасць.*

Пры адказе слухача ўлічваецца характар (істотныя і неістотныя) і колькасць допушчаных памылак. Да <u>істотных памылак</u> адносяцца: значныя скажэнні сістэмнага выкладання матэрыялу, памылкі ў асноўным фактaлагічных і тэарэтычным матэрыяле, памылковае выкарыстанне тэрміналогіі, замена істотных прыкмет характарызуемых з'яў, працэсаў неістотнымі; памылковае разуменне прычынна-выніковых сувязяў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

памылковае выкананне прадугледжаных заданнем спосабаў дзейнасці; няўменне выкарыстоўваць розныя крыніцы гістарычнай інфармацыі; супярэчнасці ў адказе. Да неістотных памылак адносяцца: нязначныя парушэнні паслядоўнасці сістэмнага выкладання матэрыялу, нядбайнае выкананне запісаў, стылістычныя хібнасці ў адказе; памылковае, з арфаграфічнага пункту гледжання, напісанне тэрмінаў.

Ацэнка пісьмовай работы адбываецца па стобальнай сумарнай шкале, а затым адбываецца пераход у дзесяцібальную шкалу. Выкладчыкам у пісьмовай рабоце вызначаецца колькасць балаў за кожнае заданне, якія затым сумуюцца. Крытэрыем пераводу выступае шкала, якая была распрацавана і выкарыстоўвалася УА “Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў” у 2007 годзе. Выбар абумоўлены прыкладным парогавым значэннем па дысцыпліне “Гісторыя Беларусі” у якасці профільнага і заліковай ацэнкай умоўна прызнаецца адзнака ў “чатыры” балы па дзесяцібальнай шкале, ці 29-38 балаў па стобальнай.

Шкала пераводу сумарнай колькасці тэставых балаў у адзнакі па дзесяцібальнай шкале

| | |
|---|---|
| 1-8 | 1 |
| 9-17 | 2 |
| 18-28 | 3 |
| 29-38 | 4 |
| 39-50 | 5 |
| 51-63 | 6 |
| 64-74 | 7 |
| 75-84 | 8 |
| 85-94 | 9 |
| 95-100 | 10 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Асноўная літаратура

1. Бохан, Ю. М. Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да канца XV ст. : вучэб. дапам. для 6-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларускай мовай навучання : у 2 ч. / Ю. М. Бохан, С. М. Цемушаў ; пад рэд. Ю. М. Бохана. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2016. – Ч. 1 – 2016. – 163 с.; Ч. 2 : – 2016. – 146 с.
2. Новик, Е. К. История Беларуси : 1917 – 1945 гг. : учеб. пособие для 10-го кл. учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / Е. К. Новик; автор метод. аппарата В. В. Гинчук. – Минск : Нар. асвета, 2012. – 182 с.
3. Фомин, В. М. История Беларуси : вторая половина 1940-х гг. – начало XXI в. : учеб. пособие для 11-го кл. учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / В. М. Фомин, С. В. Панов, Н. Н. Ганущенко ; под ред. В. М. Фомина. — Минск : Нац. ин-т образования, 2013. – 232 с.
4. Шарова Н. С., История Беларуси. Опорные конспекты для подготовки к централизованному тестированию / Н. С. Шарова. – Минск : Аверсэв, 2017. – 352 с.
5. Цэнтралізаванае тэсціраванне. Гісторыя Беларусі : зборнік тэстаў / Рэсп. інст. кантролю ведаў М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь. – Мінск : Аверсэв, 2017. – 29 с.

## Дадатковая літаратура

6. Белозорович, В. А. История Беларуси : вторая половина XVI — конец XVIII в. : учеб. пособие для 8-го кл. учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / В. А. Белозорович, И. П. Крень, Н. Н. Ганущенко. — Минск : Изд. центр БГУ, 2010. – 191 с.
7. Вялікая Айчынная вайна савецкага савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны) : вучэб. дапам. для 11-го кл. агульнаадук. устаноў / А. А. Каваленя, М. А. Краснова і інш.; пад рэд. А. А. Кавалені, М. С. Сташкевіча. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2004.
8. Гістарычны атлас Беларусі : агульнаадукацыйнае ілюстраванае выданне / Уклад. Л. Р. Казлоў. – Мінск : Арты-Фэкс, 2003. – 34 с.
9. Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да сярэдзіны XIII ст. : 6-ы кл. : хрэстаматыя : дапам. для вучняў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання / аўтар уступ. матэрыялаў, склад. С. М. Цемушаў. – Мінск : Нар. асвета, 2012. – 199 с.
10. Гісторыя Беларусі, 1917–1945 гг. : 10-ы кл. : хрэстаматыя : дапам. для вучняў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання / аўт.-склад. А. А. Каваленя [і інш.] ; метад. забеспячэнне С. А. Кудраўцовай ; пад рэд. А. А. Кавалені. – Мінск : Пачатковая школа, 2009. – 288 с.
11. Гришкевич, Т. В. История Беларуси : контрольн. работы для слушателей заоч. подготов. курсов / Т. В. Гришкевич. – Минск : БГПУ, 2012. – 64 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

12. Грышкевіч, Т. В. Гісторыя Беларусі : кантрольн. работы для слухачоў завоч. падрыхтоўчых курсаў / Т. В. Грышкевіч., Т. У. Янкоўская. – Мінск : БДПУ, 2009. – 56 с.
13. Дуда М. Ю., Гісторыя Беларусі: увесь школьны курс у табліцах. – Мінск : Современная школа, 2009. – 384 с.
14. Лазіцкі, В. Л. Трэнажор па гісторыі Беларусі для падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання і экзамену / В. Л. Лазіцкі. – Мінск : ТэтраСістэмс, 2010. – 176 с.
15. Морозова, С. В. История Беларуси : конец XVIII – начало XX в. : учеб. пособие для 9-го кл. учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / С. В Морозова, В. А. Сосно, С. В. Панов ; под ред. В. А. Сосно. – Минск : Изд. центр БГУ, 2011. – 199 с.
16. Новик, Е. К. История Беларуси XIX - начала XXI в.: учеб. пособие для 11-го кл. общеобраз. учреждений / Е. К. Новик [и др.]; под ред. Е. К. Новика. – Минск : Изд. центр БГУ, 2009.
17. Пурышева, Н. М. История Беларуси : школьный курс в кратком изложении / Н. М. Пурышева, М. И. Старовойтов. – Минск : ТетраСистемс, 2012. – 240 с.
18. Штыхаў, Г. В. Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да сярэдзіны XIII ст. : вучэб. дапам. для 6-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларускай мовай навучання / Г. В. Штыхаў, С. М. Цемушаў, В. У. Ракуць ; под рэд. Г. В. Штыхава, Ю.М. Бохана. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2009. – 143 с.
19. Штыхов, Г. В. История Беларуси : вторая половина XIII — первая половина XVI в. : учеб. пособие для 7-го кл. учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / Г. В. Штыхов, Ю. Н. Бохан, М. А. Краснова; под ред. Ю. Н. Бохана. — Минск : Народная асвета, 2009. – 159 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ